**Тэма:** Святкуем Міжнародны дзень матчынай мовы

(*выхаваўчае мерапрыемства з выкарыстаннем інтэрнэт-тэхналогій*)

**Мэта:**

садзейнічаць адпрацоўцы і замацаванню правілаў сучаснай беларускай мовы, фарміраванню асноў вымаўлення і культуры маўлення, папаўненню слоўнікавага запасу беларускай лексікай, развіццю інтэлекта, логікі і мыслення ў вучняў.

**Задачы:**

- ✓ пашырэнне ведаў вучняў па гісторыі і культуры Рэспублікі Беларусь;
- ✓ развіцце пазнавальнага інтарэсаў;
- ✓ выхоўванне нацыянальнай самасвядомасці, патрыятызму і любві да Радзімы;
- ✓ садзейнічанне фарміраванню беларускага слоўнікавага запасу вучняў.

**Абсталяванне:**

- ✓ камп'ютарны клас з выхадам ў Інтэрнэт,
- ✓ прэзентацыя да ўрока,
- ✓ файлы-нарыхтоўкі,
- ✓ беларускія песні.

Аўтар-складальнік:
педагог дадатковай адукацыі
вышэйшай катэгорыі
ДУА “Камп’ютарны цэнтр дзяцей
і моладзі г. Светлагорска”
Шэнец А.І.

## Ход занятку.

1. **Арганізацыйны момант.**
2. **Хвілінка эмацыйнага настрою.**

Каб даведацца, пра што мы сёння будзем гаварыць на нашым занятку, нам трэба разгадаць крыжаванку. Я буду называць імя пісьменніка або яго твор, а вы мне адказваеце, які ў яго псеўданім або прозвішча.

Па гарызанталі:

1. Мікалай Карлавіч Раманоўскі, псеўданім Кузьма …
2. Канстанці́н Міха́йлавіч Міцке́віч , псеўданім Якуб …
3. Выдатны беларускі пісьменнік, педагог, філосаф, багаслоў і прапаведнік, імя якога ў XVI стагоддзі было шырока вядомае ў краінах Заходняй Еўропы, Сымон …
4. Яўген Іванавіч Скурко. Ёсць такая баявая тэхніка. Максім …
5. Іван Дамінікавіч Луцэвіч, яго псеўданім гучыць, як свята з 6 на 7 ліпеня …
6. Аўтар рамана “Сэрца на далоні”.
7. Народны пісьменнік Беларусі, празаік, драматург, публіцыст. Аўтар раманаў «Людзі на балоце» і «Подых навальніцы».
8. Беларускі пісьменнік, паэт, сатырык, драматург, перакладчык Кандрат Атраховіч, псеўданім Кандрат …
9. Беларускі грамадскі дзеяч, пісьменнік, паэт і перакладчык. Акадэмік АН БССР Пятрусь …

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | Ч | О | Р | Н | Ы | |
| | | | 2 | К | О | Л | А | С |
| | | 3 | Б | У | Д | Н | Ы | |
| | | 4 | Т | А | Н | К | | |
| | 5 | К | У | П | А | Л | А | |
| | 6 | Ш | А | М | Я | К | І | Н |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 7 | М | Е | Л | Е | Ж |
| | | | 8 | Ч | О | Р | Н | Ы | |
| 9 | К | Р | А | П | І | В | А | | |
| 10 | Б | Р | О | Ў | К | А | | | |

- Дзякуючы такім творцам, як Васіль Быкаў, Іван Шамякін, Янка Брыль, Максім Танк, Уладзімір Караткевіч і інш., наша сучасная літаратура вядомая за межамі Беларусі: у Польшчы, Германіі, Балгарыі, Чэхіі і іншых заходнееўрапейскіх краінах, былых рэспубліках СССР, а таксама пра яе дачуліся ў Кітаі, Індыі, Японіі... Творы Васіля Быкава перакладаліся больш чым на пяцьдзесят моў свету, Івана Шамякіна — больш чым на трыццаць, на дзясятках нацыянальных моў загучалі творы іншых беларускіх пісьменнікаў — творы, якія прынеслі іх аўтарам вядомасць і прызнанне. Слушна і справядліва сёння гаворыцца пра тое, што творчасць Васіля Быкава — "з'ява не толькі ў беларускай, але і... у сусветнай літаратуры, у сусветнай прозе". Трэба пагадзіцца з Рыгорам Барадуліным, які зазначаў, што "любая літаратура можа сказаць, што яна багатая і сталая, калі мае свайго Ўладзіміра Караткевіча".

- Давайце разам прачытаем словы па вертыкалі нашай крыжаванкі.
- Родная мова.
- А зараз мы паслухаем верш Уладзіміра Дубоўкі “Родная мова, цудоўная мова!..”.

*Вучань чытае верш.*

Родная мова, цудоўная мова!
Ты нашых думак уток і аснова!
Матчын дарунак ад самай калыскі, −
Ты самацветаў яскравая нізка.
Кожны з іх барвы дзівосныя мае,
Вечным агнём зіхаціць – не згарае.
Ты мне заўсёды была дапамогай,
Дзе б і якой не хадзіў я дарогай.
Чую ў табе пераразвоны крыніцы,
Чую ў табе і раскат навальніцы,
Чую павевы зялёнага бору,
Водгулле працы ў родным прасторы.
Кожнай драбнічкай ты варта пашаны,
Кожнае слова вякамі створана.
І на вякі яно жыць застанецца,
Вечнае так, як народнае сэрца.

- Сапраўды, родная мова ўваходзіць у наша жыццё з вуснаў маці. Прыгожае гучанне роднага слова мы пачынаем успрымаць з матчыных песень, цудоўных беларускіх казак, легендаў, паданняў. З роднай мовай мы пакідаем

бацькоўскі парог, выпраўляючыся ў далёкія вандраванні. І пачуццё роднай зямлі, якое неяк губляецца, калі ты жывеш на ёй, асабліва абвастраецца, калі апынешся дзесьці далёка. Тады ўспамінаецца кожны куток роднай зямлі, яе людзі, асабліва мілагучнай становіцца мова.

- Сёння, напэўна, няма пісьменнікаў, якія не выказалі б сваіх адносін да роднай мовы. У шматлікіх радках песняроў падкрэсліваецца яе значэнне ў жыцці грамадства, багацце і адметнасць, паказваецца сувязь мовы народа, культуры і гістарычнай памяці.
- Мова – душа народа, векавая праца многіх пакаленняў, люстэрка духоўнага жыцця і творчасці грамадства, наш галоўны і неацэнны скарб. І сёння гонар і абавязак усіх нас – шанаваць родную мову, садзейнічаць яе развіццю і росквіту.

3. **Паведамленне тэмы, пастаноўка мэт і задач.**

- Тэма нашага занятку: Родная мова, цудоўная мова!
- Сення мы з вамі будзем папаўняць слоўнікавы запас беларускімі словамі, развіваць інтэлект, логіку і мысленне. Таксама мы будзем выхоўваць нацыянальную самасвядомасць, патрыятызм і любоў да Радзімы, вучыцца дзейнічаць у камандзе.
- А вы ведаеце, што есць свята, якое называецца Міжнародны дзень роднай мовы? Давайце знойдзем інфармацыю пра яго.

4. **Практычная работа № 1.**

Вам неабходна знайсці інфармацыю пра гэтае свята ў інтэрнэце і захаваць яе ў тэкставым рэдактары MS_Word.

Работа з Інтэрнэт-рэсурсамі.

5. **Гутарка з вучнямі.**

- Сапраўды, 21 лютага ва ўсім свеце адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы. Чаму для святкавання быў абраны гэты дзень?
- 21 лютага ў далёкім для нас 1952 годзе загінулі 5 студэнтаў, якія змагаліся за наданне мове бенгалі статуса дзяржаўнай у тагачасным Пакістане, усходняя частка якога пазней стала незалежнай дзяржавай Бангладэш. Адзначаецца гэты дзень з 2000 года.
- А ці ведаеце вы, што па дадзеных ЮНЕСКА ў свеце існуе больш за 6000 моў, 95% з якіх знаходзяцца ва ўжытку ў насельніцтва планеты. Частка моў не мае сваёй пісьменнасці. Больш за палову існуючых моў свету знаходзяцца на мяжы вымірання. Тысячы моў не выкарыстоўваюцца ў сістэме адукацыі і не

прадстаўлены ў Інтэрнеце. Кожны месяц знікаюць 2 мовы. Яшчэ нядаўна налічвалася да 8000 самастойных моў. Сёння іх на 2000 менш. Беларуская мова таксама лічыцца выміраючай... Таму мы збіраемся разам даказаць адваротнае!

- У гэты Міжнародны год роднай мовы прысвечаны тэме «Інфармацыйныя тэхналогіі і камунікацыі ў справе захавання і папулярызацыі моў і моўнай разнастайнасці». Яе выбар падкрэслівае велізарны патэнцыял новых тэхналогій у захаванні, дакументаванні і падтрымцы выкарыстання родных моў. У бягучым годзе ЮНЕСКА пачне правядзенне кампаніі з выкарыстаннем сацыяльных сетак Твітэр і Фэйсбук з мэтай далучыць карыстальнікаў Інтэрнэту да абмену вопытам, фатаграфіямі і відэасюжэтамі, якія дэманструюць патэнцыйныя магчымасці новых тэхналогій у аказанні падтрымкі моўнай разнастайнасці.
- Некаторыя словы для многіх з нас застаюцца невядомымі.
- Напрыклад,
- Давайце знойдзем іх значэнне з дапамогай Інтэрнэт-слоўніка.

**6. Практычная работа № 2 (у групах).**

- Знайдзіце, калі ласка, значэнне слоў: *немаўля, вятрыска, цяпельца, шаты, жарсць, мроя, прысады, неспадзеўка, альтанка.*
- А можа хто-небудзь з вас ведае словы, якіх мы не чулі, тады вы таксама можаце іх нам прапанаваць для тлумачэння.
- Работа со слоўнікам на старонцы інтэрнэт-рэсурса https://translate.google.ru/#be/ru/%D0%BC%D0%B0%D1%88%D1%8D%D0%BA%D0%B0
- Можна прапанаваць вучням знайсці якія-небудзь другія цікавыя словы.
- Пасля заканчэння - каллектыўная праверка.

**7. Фізкультмінутка.**

- Вы добра папрацавалі, і зараз самы час адпачыць.

Я маленькі дрывасек!
Так я сёння дрэвы сек… (Імітуюць рухі дрывасека.)
Пянёк справа, пянёк злева… (Нахіляюцца.)
Ой! Спіна мая замлела! (Нахіляюцца назад.)

- Рабяты, а вы ведаеце, што галоўная функцыя загадкі – развіваць у чалавека мастацка-вобразнае мысленне, паэтычны погляд на рэчаіснасць. У мінулым загадка служыла сродкам выпрабавання разумовых здольнасцяў, іншасказальная, загадкавая форма з поспехам выкарыстоўвалася ў ваенных і пасольскіх справах. Загадкі, песні-загадкі надзвычай шырока ўжываліся ў вясельных абрадах, напрыклад, з мэтай “праверкі” разумовай сталасці жаніха.

- Каштоўнасць традыцыйнай загадкі ў тым, што яна ў высокапаэтычнай форме адлюстроўвала гаспадарчую і творчую дзейнасць чалавека, яго жыццёвы вопыт, побыт, працу і да нашых дзён мае вялікае эстэтычна-мастацкае значэнне для выхавання дзяцей.
- Зараз мы праверым, ці ведеце вы жывёл нашай краіны. Я буду чытаць вам загадкі, а вы будзеце адказваць ці паказваць, хто гэта.

✓ Ідзе ён паважна,
Шыпіць вельмі страшна.
І за пяткі ўсіх шчыпае,
Лапкі, нос чырвоны мае. (Гусак)

✓ Есць зялёную траву,
І гаворыць так: „Му-Му“.
Любіць грушу спелую,
Дае вадзіцу белую. (Карова)

✓ З грывай, а не конь,
З рагамі, а не бык,
З барадой, а не казёл.
Гучна-гучна зароў
Цар пушчанскіх звяроў. (Зубр)

✓ Гальчастыя рогі, хуткія ногі,
колер поўсці — залаты.
Хто я, ці ведаеш ты? (Алень)

✓ У ваду нырае смела,
Хатку ён будуе ўмела,
Пад вадой і на вадзе
Будаўніцтва ён вядзе. (Бабёр)

✓ Ён прысмакаў з'еў нямала,
А калі харчоў не стала,
Лапу смокчучы, заснуў,
Ледзьве не праспаў вясну. (Мядзведзь)

✓ У рыжай разбойніцы хвост, як мятла.
Ад кары ўцякла – сляды замяла. (Ліса)

✓ З ялінкі на ялінку,
З галінкі на галінку
Скача агеньчык жывы...
Хто гэта? Знаеце вы? (Вавёрка)

✓ Мышак ловіць, ды не коцік ён,
І лісты носіць, ды не паштальён.

Каб лісе не трапіць на зубок,
У калючы скруціцца клубок. (Вожык.)

- Малайцы, дзеці. Вы вельмі добра ведаеце жывёл Беларусі.

**8. Працяг гутаркі.**

- А ці ведаеце вы, што паводле перапісу насельніцтва беларускую мову назвалі роднай 5 мільёнаў 58 тысяч грамадзян Беларусі. Сярод беларусаў гэтую мову лічаць роднай крыху больш за 60%. Большая частка насельніцтва (70%) аддае перавагу рускай мове. На ёй размаўляюць 96% рускіх, 88% украінцаў, 70% беларусаў, 51% палякаў. Па-беларуску дома размаўляюць 26% беларусаў і … 41% палякаў.
- З 45 тысячамі дашкольнікаў (12%) ва ўстановах дашкольнай адукацыі выхавацелі размаўляюць па-беларуску. 18% (164 тысячы) беларускіх школьнікаў вывучаюць усе прадметы на беларускай мове.
- Традыцыйна ў нашай краіне кожны новы год аб'яўляецца годам напрамку, якому дзяржавай і грамадствам надаецца пільная ўвага. А вы ведаеце, як называецца 2016 год ў нашай краіне?
- Так, указам Прэзідэнта 2016 год абвешчаны Годам культуры. А якія з падзей гэтага году вам запомніліся? (Слухаем адказы вучняў)
- Яшчэ 2016 год – гэта год юбілеяў такіх вядомых дзеячаў беларускай літаратуры, як К. Крапіва (120-годдзе) і І. Шамякін (95-годдзе).
- А ёсць у нашай краіне лаўрэаты Нобелеўскай прэміі? І хто гэта?
- У 2015 годзе Святлана Алексіевіч стала лаўрэатам Нобелеўскай прэміі па літаратуры з фармулёўкай «за яе шматгалосную творчасць - помнік пакуты і мужнасці ў наш час». Святлана Алексіевіч - першы Нобелеўскі лаўрэат у гісторыі Беларусі.

**9. Практычная работа № 3.**

Інтэрактыўная міні-віктарына па беларускай мове.

- http://adu.by/ru/homepage/novosti/prazdniki-i-znamenatelnye-daty/320-da-mizhnarodnaga-dnya-rodnaj-movy.html

Выяўленне пераможцаў.

**10. Вынікі ўроку.**

- На роднай мове мы гаворым нашы першыя словы і найлепш выказваем свае думкі. Гэта тая аснова, на якой усе людзі будуюць сваю асобу з моманту свайго першага ўздыху, і яна тое, што арыентуе нас на працягу ўсяго жыцця. Яна

з'яўляецца спосабам, з дапамогай якога можна навучыць паважаць сябе, сваю гісторыю, сваю культуру і галоўнае – іншых людзей з усімі іх асаблівасцямі».

- Беларуская мова адносіцца да ўсходнеславянскай падгрупы індаеўрапейскай моўнай сям'і. Яна, безумоўна, мае шмат агульных граматычных і лексічных рыс з рускай і ўкраінскай мовамі. Аднак і спецыфічных адметнасцей багата ў нашай роднай мове. Гэта дзеканне і цеканне, аканне і яканне, зацвярдзелыя зычныя і суседняя мяккасць, у нескладовае і апостраф. А колькі самабытных беларускіх слоў!

- Вось такіх, напрыклад, як у радках Кастуся Цвіркі:

*Абрус – абцас – азярод – арэлі…*
*Вясёлка – вырай – вярба – ваўчкі…*
*Як міла пазвоньваюць, сэрца грэючы,*
*Чыстых бацькаўскіх слоў ланцужкі!*
*Зямлі маёй перлы, дзе іх адшукалі?*
*Спытай у магіл: удзень і ўначы*
*Іх, з бурамі дужаючыся, здабывалі*
*Людзі простыя – крывічы.*
*Каб ярка свяцілася перлінка-слова,*
*Каб людзям зіхцела – на ўсе бакі,*
*Яго шліфавалі як след, адмыслова*
*Найлепшыя ў свеце тачылы – вякі.*
*Ды лезлі чужынцы – мой край прысвойваць –*
*І ўсюды (бо трос душы чорныя страх)*
*Знішчалі агнём беларускае слова,*
*Палячы геніяў на кастрах.*
*Але ўратаваў люд мой слова ад згубы*
*І, гонячы катаў ад родных бяроз,*
*Праз далеч стагоддзяў сівых –*
*З губ у губы – да нас, незамутненае, данёс.*
*Як скарб дарагі, перададзены ў спадчыну,*
*У сэрцы хавае народ мой ад здрад*
*Праменнае звонкае слова матчына*
*Для песень сонечных і балад!*

- Дык давайце ж будзем размаўляць па-беларуску! І не толькі 21 лютага, а заўжды!

**11. Рэфлексія.**

- Я прапаную вам “10 запаведзяў” Віктара Шведа.

Мову родную беражы.
Мовай роднаю даражы.
Мову родную шануй.
Мовай роднай не гандлюй.
Мову родную любі.
Мовы роднай не кідай.
Мову дзецям перадай.
Мовы не аддай на здзек.
Толькі з ёю жыцця век.

- На гэтым наш урок падышоў да заканчэння. Вы ўсе добра працавалі. Самымі актыўнымі на ўроку былі… (прозвішчы вучняў).

- А зараз, калі ласка, прымацуйце лісточкі да нашага Дрэва Настрою. Калі ў вас добры настрой і ўсё спадабалася на ўроку – жоўты; калі нечым не задаволены і нешта не атрымалася – чырвоны; калі дрэнны настрой і трэба дапамога па тэме – блакітны.

- Якую мову выбіраць, залежыць толькі ад нас саміх. Але...

*Не пакідайце ж мовы*
*нашай беларускай,*
*каб не ўмёрлі.*
*(Францішак Багушэвіч)*

**12. Інтэрнэт-рэсурсы**


1. http://adu.by/ru/homepage/novosti/prazdniki-i-znamenatelnye-daty/320-da-mizhnarodnaga-dnya-rodnaj-movy.html
2. http://belazar.info/
3. http://vyaselka.ru/content/zagadka
4. http://belzag.blogspot.com.by/2012/11/blog-post_18.html
5. http://volkovysk.by/society/svyatkuem-mizhnarodny-dzen-matchynaj-movy.html